УДК 808.26-3

Н.П. Жорава

# Асаблівасці рэпрэзентацыі касмаганічных аб'ектаў у мове беларускіх загадак

Сярод тэматычнай разнастайнасці загадак асобную, даволі шматлікую групу складаюць творы, прысвечаныя з'явам прыроды, у прыватнасці, небу і нябесным свяцілам. Як адзначаюць фалькларысты, такія загадкі адрозніваюцца старажытнасцю свайго паходжання і архаічнасцю метафарычных вобразаў, пакладзеных у іх аснову. Касмаганічныя лексемы, прадстаўленыя ў аналізуемым матэрыяле 177 адзінкамі, у гэтым выпадку ўваходзяць не ў структуру тэксту загадкі, якая рэпрэзентуе нябесны аб'ект праз суму стэрэатыпных якасцей у разгорнутай апісальнай форме сказа, а ў структуру адгадкі. Загадка ў такім выпадку разглядаецца як бінарная структура, часткі якой (уласна загадка і адгадка) звязаны паміж сабой непарыўнымі семіятычнымі, паэтычнымі і семантычнымі сувязямі, заснаванымі на асацыятыўным мысленні і творчай фантазіі. Паколькі тэкст загадкі як своеасаблівы тып намінацыі павінен стымуляваць адрасата дакладна назваць аб'ект-дэнатат, яго кампанентамі ў прамой або апасродкаванай форме выступаюць семантычныя паказчыкі, што ўтвараюць значэнне лексемы, змешчанай у адгадцы. З другога боку, гэта наўмысна трансфармаванае, эстэтычна маркіраванае апісанне рэальнасці, што адрознівае загадку ад артыкулаў тлумачальных слоўнікаў. Апісальная частка дадзеных твораў будуецца ў адпаведнасці з прагматычнай задачай, якая заключаецца ў ідэнтыфікацыі загаданых канцэптаў шляхам рэпрэзентацыі іх праз суму канцэптуальных, стэрэатыпных якасцей, якія з'яўляюцца нерэлевантнымі для звычайнага тэксту, арыентаванага на індывідуальнае.

Вызначым асноўныя віды і спосабы рэпрэзентацыі ў загадцы касмаганічных аб'ектаў. Аналіз фактычнага матэрыялу дазваляе вылучыць у гэтым жанры два віды фальклорнай намінацыі:

а) намінацыя з увядзеннем кодавага дэнатата, які прадстаўляе зашыфраваны аб'ект у загадцы (82% тэкстаў): *Сярод поля ляжыць капыток (Маладзік); Поле не мерана, авечкі не лічаны, пастух рагаты (Неба, зоркі, месяц); Пасцялю дзяружку, пасыплю гарошку і палажу лусту хлеба (Неба, зоркі, месяц); Свечак многа гарыць, а ніводнай не патушыць (Зоркі); Красненькі пеўнік па жэрдачцы ходзя (Сонца);*

б) намінацыя без увядзення кодавага дэнатата шляхам апісання сукупнасці ўласцівасцей або функцый аб'екта (18% тэкстаў): *Ясненька, жоўценька, люду міленька (Сонца); Кругленька, залаценька, увесь свет абяжыць (Сонца); Усе яго любяць, чакаюць, а глянуць, убачуць – адразу заплачуць (Сонца); Круглае, доўгае, ніхто яго не дастане (Неба); Што сіня не сінячы? (Неба).*

Пад кодавым дэнататам або, па іншай тэрміналогіі, яўным тэрмінам [1], трансформам [2] мы разумеем назоўнік, які адвольна замяшчае або

метафарычна прадстаўляе загаданы аб'ект, з'яўляючыся разам з тым асновай мастацкага вобраза загадкі. Кодавы дэнатат можа быць выражаны:

1) прамой намінацыяй (назвай) праз агульны ці ўласны назоўнік: *За лясамі, за гарамі, за вялікімі марамі залатая дзяжа кісне (Сонца); На паляне сіняй пасецца конь сівы (Месяц на небе); Сіняя пасцілка ўвесь свет накрыла (Неба); На полі Ярох рассыпаў гарох, стала світаць – няма чаго сабіраць (Неба, зоркі); Узойдзе Ягор на бугор – вышэй лесу, вышэй гор, з бугра спускаецца – з вачэй хаваецца (Сонца).* У такім выпадку кодавы дэнатат выражаецца адвольным або матываваным словам. Да адвольных мы адносім назоўнікі, якія не нясуць інфармацыі пра адгадку, не маюць агульных з ёй семантычных крытэрыяў. Сярод іх вылучаюцца ўласныя назоўнікі (Ягор), назвы асобы (дзяўчыца, брат, сястра, маладзён, пастух) і назвы жывёл і птушак (авечкі, баранчыкі, конь, казёл, быдла, парасяты, кісанька, птушка, пеўнік, пціца-верацяніца, курка): *Ішоў маладзён ні дарогай, ні пуцём, а памыўся ні вадою, ні расою, а ўцёрся ні тканым, ні праным (Месяц); Брат сястру шукае, а сястра ад яго ўцякае (Сонца і месяц); Стаіць дуб-шкарадуб, на тым дубе-шкарадубе сядзіць красная дзяўчыца (Сонца); Махнула птушка пяром, пакрыла ўвесь свет крылом (Сонца); У сінім мяшочку шмат белых парасят (Неба і зоркі).*

Асобна адзначым ужыванні, у якіх кодавы дэнатат загаданага аб'екта (у прыватнасці, зорак) абазначае пэўнае мноства аб'ектаў, г.зн. выражаны назоўнікам у форме множнага ліку (авечкі, парасяты) або зборным ці рэчыўным назоўнікам (быдла, гарох, бульба, зерне і г.д.). У такіх выпадках кодавы дэнатат, які можа з'яўляцца адвольным словам, нясе інфармацыю пра тое, што загаданы аб'ект з'яўляецца множным: *Сівы пастух авечак пасе (Месяц і зоркі); Рассыпалася к ночы зярно, глянулі наранні – аж няма нічога (Зоркі); Рассыпаўся гарох на тысячу дарог, ніхто не падбярэ: ні цар, ні царыца, ні пятух, ні курыца (Зоркі на небе).*

Паколькі метафара як асноўны прыём, на якім будуецца загадка, прадугледжвае абгрунтаваную, матываваную замену з апорай на пэўныя семантычныя або асацыятыўныя сувязі на ўзроўні агульнамоўнай або фальклорнай традыцыі, большасць кодавых дэнататаў уяўляюць сабой матываваную назву.

2) Кодавы дэнатат можа выражацца пры дапамозе негацыі – адмоўнай канструкцыі, якая эксплiцытна адлюстроўвае нятоеснасць з загаданым прадметам: *Коціцца бачурачка, ні звер, ні птушачка (Месяц); Кацілася катушачка – ані звер, ані птушачка, ані камень, ні вада, не адгадаеш нікагда (Сонца).* Дэнататы-негатары не з'яўляюцца пашыраным спосабам намінацыі касмаганізмаў і складаюць 1,3% загадак з кодавым дэнататам, але пры гэтым выконваюць істотную ролю пры разгадванні, цалкам выключаючы з адгадак цэлы клас аб'ектаў, прадстаўленых негатарам.

3) У асобных прыкладах (каля 0,8%) кодавы дэнатат можа выражацца параўнальнай канструкцыяй, якая эксплiцытна падкрэслівае падабенства з загаданым касмаганічным аб'ектам: *Доўгі, як качалка, круглы, як качан (Месяц).*

Абодва віды намінацыі рэпрэзентуюць загаданы касмаганічны аб'ект праз сукупнасць яго тыповых уласцівасцей і функцый, выражаных непасрэдна або апасродкавана. У першым выпадку пэўныя якасці або функцыі касмаганічнага аб'екта, адлюстраваныя адпаведнымі семамі ў семантычнай структуры назоўніка-касмаганізма, эксплiцыруюцца пераважна пры дапамозе прыметнікаў або/і дзеясловаў: *Маленька, залаценька, усё поле асвеціць (Сонца); Вісіць сіта круглавіта, залатое, навітое (Сонца).* Пры апасродкаваным выражэнні назіраецца пэўнае супадзенне семантычных характарыстык касмаганізма і кодавага дэнатата, што служыць асновай для

стварэння фальклорнай метафары. Напрыклад, назоўнікі **зерне** і **зоркі** збліжаюцца ў загадцы на падставе агульнасці семантычных паказчыкаў колеру (светлы, жаўтаваты, залацісты), памеру (малы, дробны), формы (круглы або вастраканцовы). Актуалізаваны набор семантычных паказчыкаў можа рэпрэзентаваць касмаганізмы ў апісальнай частцы загадкі праз:

1) пастаянную прымету колеру (залаты, белы, сівы, сярэбраны, срэбны, сіні, чорны, красненькі, чырвоны, жоўты), формы (круглы, кругленькі, круглавіты, крутарогі, рагаты), памеру (маленькі, доўгі, нямераны, нязмераны), яркасці (іскрысты, ясненькі), уяўнай аддаленасці (высокі), колькасці (нелічаны, незлічаны), выражаную эксплiцытна пры дапамозе азначэнняў.

*Маленькае, залаценькае, увесь свет абяжыць (Сонца); Разаслана пасцілка, на пасцілцы рассыпаны сярэбраны пясочак, а пасярэдзіне залаты кружочак (Месяц, зоркі на небе); Глянь праз акно, відаць сіняе палатно (Неба); Доўгі, як качалка, круглы, як качан (Месяц); Белыя кветачкі ўвечар квітнеюць, а ранкам вянуць (Зоркі); Круглае, доўгае, ніхто не дастане (Неба).*

Пералічаныя вышэй паказчыкі могуць быць выражаны ў апасродкаванай форме праз семантычную структуру метафарычных кодавых дэнататаў. Напрыклад, круглая форма сонца імпліцытна адлюстравана назоўнікамі-асацыянтамі *талерачка, міска, катушачка, качулачка, аладка, шар, сіта, вочы;* форма поўнага месяца – назоўнікамі *клубок, бачурачка, вока;* маладзіка – назоўнікамі *капыток, крайчык, луста хлеба;* памер і форма зорак – назоўнікамі *гарошак, дзірачка, свечка, зерне, пясочак, каточкі;* прасторавая характарыстыка неба – назоўнікамі *палатно, дзяружка, рагожка, радно, пасцілка, кажух, поле, дарожка, горад і г.д.* У прыведзеных і іншых назоўніках-асацыянтах наўрад ці варта гаварыць пра перавагу пэўнага якаснага паказчыка, бо пры стварэнні метафарычнага кодавага дэнатата пад увагу звычайна бярэцца комплексная характарыстыка аб'екта.

2) Рэпрэзентацыя праз функцыю або характэрнае дзеянне касмаганічнага аб'екта (рух па небасхіле і яго асаблівасці, здольнасць вылучаць святло, цяпло, асаблівасці псіхалагічнага ўспрыняцця і інш.). *Сястра да брата ў госці ідзе, а брат ад яе хаваецца (Сонца і месяц); У горадзе-гарадзе плыве талерачка па вадзе (Сонца); Усе яго любяць, чакаюць, а глянуць, убачуць – адразу заплачуць (Сонца); Ходзіць курка-жаўтушка па сене і не шастае (Сонца), Што гэта за вочы: адно свеціць удзень, другое – уночы (Сонца і месяц); На гары гаранскай каціўся шар вярханскі, ніхто яго не аб'едзе і не абыдзе (Сонца).* Асноўную сэнсавую ролю ў такім разе, як правіла, выконвае дзеяслоў, які выступае ў ролі дакладнага або пераўтворанага (метафарычнага) слова. Праўда, сам характар пераўтварэнняў дзеясловаў з'яўляецца значна больш неакрэсленым, чым прыметнікаў. Часцей за ўсё дзеяслоў, звязаны з дзеяннямі чалавека ці жывой прыроды, называе дзеянне або стан, падобны ў тых або іншых адносінах на сапраўднае дзеянне касмаганічнага аб'екта. Напрыклад, кодаваму дэнатату, які рэпрэзентуе лексему **сонца**, прыпісваюцца спецыфічныя дзеянні (функцыі): *гарыць, свеціць, грэе, ззяе, зямлю ажыўляе, дае жыццё, ідзе, ходзіць, абяжыць, плавае, коціцца, лятае, узыходзіць, спускаецца і інш.*, адпаведна месяц – *ідзе, каціўся, пасецца, глядзіць, свеціць, не грэе, хаваецца, знікае і г.д.*; зоркі – *рассыпаліся, каціліся, бліщчаць, гараць, не лічаны;* неба – *свет накрыла, пакрыла*. Дастаткова пашыранымі з'яўляюцца спалучэнні кодавага дэнатата з інактыўным дзеясловам тыпу **«стаіць»**, **«ляжыць»**, **«вісіць»** або сэнсава тоесныя ім канструкцыі: *Што гэта за аладка на небе вісіць (Сонца); Сярод хаты /клеці/ сала вісіць (Сонца); Сярод поля ляжыць капыток (Месяц); Рассцялю дзяружку, пасыплю гарошку трошку, палажу акрайчык хлеба (Неба, зоркі, месяц); Сядзіць, сядзіць на небе і знікае (Месяц).* Такія

канструкцыі, на наш погляд, абумоўлены жанравай спецыфікай загадак, якая праяўляецца не толькі на семантычным, але і на граматычным узроўні, таму дамінуючай дзеяслоўнай формай з'яўляецца так званы неактуальны цяперашні час, іншымі словамі – пазачасавае значэнне, якое назіраецца і пры актыўным дзеяслове: *На паляне сіняй пасецца конь сівы (Месяц).* Другой дзеяслоўнай дамінантай, на думку Т.М. Нікалаевай [3], можна лічыць вынікова-перфектную форму, якая, як вядома, гістарычна і па змесце звязана з цяперашнім часам: *Кацілася катушачка – ні звер, ні птушачка, ні камень, ні вада, не адгадаеш нікагда (Сонца).*

3) Рэпрэзентацыя праз асаблівасці ўзаемаразмяшчэння або аб'екты валодання (пры гэтым сонца, месяц, зоркі разглядаюцца як неад'емныя, неадчужальныя аб'екты на небасхіле). Такія загадкі грунтуюцца на катэгорыі пасесіўнасці, якая разумеецца як адносіны паміж дзвюма існасцямі, пры якіх адна з іх (аб'ект валодання) «уключаецца» ў другую (уладальнік, пасесар), складаючы з ёй адзінае фізічнае і/або функцыянальнае цэлае [4]. У якасці ключа да адгадкі выкарыстоўваюцца квантытатыўная, прасторавая (палажэнне ў прасторы), часавая прыметы: *Поле не мерана, авечкі не лічаны, пастух рагаты (Неба, зоркі, месяц); Што гэта за вочы: адно свеціць удзень, другое ўночы (Сонца, месяц); У сінім мяшочку шмат белых парасят (Неба, зоркі).* Для абазначэння прыблізна аднародных, але раздзеленых у прасторы і часе касмаганічных аб'ектаў, якія ўспрымаюцца як адзінае цэлае, у адзінкавых выпадках могуць выкарыстоўвацца тэрміны сваяцтва: *Сястра да брата ў госці ідзе, а брат ад яе хаваецца (Сонца, месяц); Брат сястру шукае, а сястра ад яго ўцякае (Сонца, месяц).*

Часцей за ўсё назоўнік ***неба***, які выконвае функцыю пасесара, выражаны ў загадках праз кодавы дэнатат (поле, паляна, дарога, горад і інш.). Аднак у асобных выпадках пасесар можа быць названы эксплiцытна, што дапамагае ідэнтыфікаваць неадчужальныя аб'екты валодання (нябесныя свяцілы) ужо толькі па адной якасці – неадчужальнасці дадзеных аб'ектаў ад дадзенага пасэсара: *Што гэта за аладка на небе вісіць (Сонца); Яно на небе плавае, іскрыстае, рухавае, жыццё дае палеткам, і збажыне, і кветкам (Сонца).* Сярод вышэйпералічаных адносін найбольш прадуктыўнымі для дадзенага спосабу рэпрэзентацыі з'яўляюцца прасторавыя, у тым ліку і адносіны «адно ў адным».

4) Рэпрэзентацыя праз сувязь з пэўным працэсам паводле:

– адсутнасці непасрэднага дзеяння: *Што гарыць без полымя? А сіняе не сінёна? (Сонца, неба); Ні стучыць, ні гручыць – у ваконца глядзіць (Сонца);*

– адсутнасці выніку дзеяння: *Мяту, мяту – не вымету, нашу, нашу – не вынашу, як пара прыйдзе – само яно выйдзе (Сонца); К сатане ходзіць да не сватае (Сонца); Відзен край, а дабрацца да яго нельга (Небасхіл);*

– парушэння спосабу дзеяння: *Без агню гарыць, без ног ідзе, а без крылаў ляціць (Сонца, дождж, хмара); Ішоў маладзён ні дарогай, ні пуцём, а памыўся ні вадою, ні расою, а ўцёрся ні тканым, ні праным (Месяц).*

Відавочна, што ўсе спосабы рэпрэзентацыі касмаганічных аб'ектаў абумоўлены актуалізацыяй пэўнага набору семных кампанентаў касмаганічных лексем, пакладзенага ў аснову апісання або выбару кодавага дэнатата. Семантыка адказу, г.зн. выбар лексемы для характарызацыі ўтоенага дэнатата, вызначаецца прыметамі ўтоенага дэнатата, указанне на якія або свядомае скажэнне якога з мэтай заблытаць адгадвальніка ўтрымліваецца ў вобразнай частцы загадкі. Рэпрэзентацыя касмаганічных аб'ектаў, якая хоць і абапіраецца на агульнамоўную семантычную структуру аналізуемых лексем, адбываецца з улікам традыцыйнага жанравага мастацкага канона, што прыводзіць да стварэння вобразаў, адрозных як ад навуковых, так і штодзённа-бытавых уяўленняў. Пацвярджэннем гэтаму

з'яўляецца і ўстойлівы, дакладна акрэслены набор кодавых дэнататаў, якія замяняюць касмаганізмы ў апісальнай частцы, нягледзячы на тое, што актуалізаваны набор семных кампанентаў уласцівы, безумоўна, больш шырокаму колу назоўнікаў, пра што сведчаць нетрадыцыйныя, аказіянальныя кодавыя дэнататы ў сучасных загадках.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Загадкі.* Мн., 1972. С. 31.
2. ***Волоцкая З.М.*** Ассоциативные связи природных явлений в фольклорной картине мира // Этнолингвистика текста. Семиотика малых форм фольклора: Тезисы и предварительные материалы к симпозиуму. М., 1988. С. 310.
3. ***Левин Ю.И.*** Семантическая структура загадки // Паремиологический сборник. Пословица. Загадка (Структура, смысл, текст). М., 1978. С. 6.
4. ***Головачева А.В.*** Стереотипные ментальные структуры и лингвистика текста. М., 2000. С. 7, 15.


## SUMMARY


*The article is devoted to the research of the main ways and types of the representation of cosmological objects in the language of Belarussian riddles.*